

# МАЛЕБЕНЬ З КАНОНАМ ДА СЬВЯМУЧАНІКА ГЕОРГІЯ БОРТНІКА

З канвалютам службы ў дзень памяці 1 лістапада

Львоў
2007 л.Б.





Парахфія свт. Кірыла Тураўскага, г.Львоў

Складзены сьвятаром Сяржуком Горбікам

Дзеля служэньняў Беларускам Праваслаўнам Абрадзе

## Сьвятамучанік Георгі Бортнік (1919 — 1951)

*Сын праваслаўнага сьвятара Венэдыкта Бортніка. Бацька служыў і жыў у вёсцы Забор'е цяперашняга Глыбоцкага раёну Віцебскай вобласьці. Магчыма, ён там і нарадзіўся.*

*Вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі. Падчас нямецкай акупацыі быў сябрам Саюза Беларускай Моладзі на Глыбоччыне, быў у Альбярцінскай школе. Летам 1944 г. выехаў у Нямеччыну. З восені 1944-га — сябра Беларускай Незалежніцкай Партыі. Вайсковец Першага кадравага беларускага батальёну.*

*У пачатку 1945 г. закончыў падафіцэрскую школу ў Баварыі, з красавіка 1945-га служыў камандзірам дружыны 3-га батальёна дывізіі Зіглінга. З траўня 1945 г. быў у амерыканскім палоне. Знаёміца з архіяпіскапам Пінскім Аляксандрам (Іназемцавым), ад якога бярэ дабраславеньня на павяртаньня і прыняцьця сьвятарскае годнасьці. Як рэпатрыянт у сьнежні 1945-га вярнуўся ў Беларусь, у Пліскі раён Полацкай вобласьці (цяпер Глыбоцкі раён). З 1947 г. вучыўся ў Жыровіцкай духоўнай сэмінарыі.*

*У канцы 1945 – у пачатку 1946 г. стварыў падпольную антысавецкую групу. Яна супрацоўнічала з падпольным Саюзам Барацьбы Супраць Камунізму. Займаліся распаўсюдам антысавецкіх улётак. Пасьля гібелі ў 1948 г. Пятра Шыпка, кіраўніка Саюза, Бортнік стаў кіраўніком арганізацыі.*

*7 верасьня 1947 г. узяў шлюб з Леанілай Бортнік, дачкой псаломшчыка Аляксандра Барадзіна. У іх нарадзіліся двое дзетак: Лаўр (1948), Алег (1950). Служыў у царкве ў в. Забор'е па беларуску, дапамагаў бацьку. Паводле сьведчаньняў, быў капелянам беларускіх паўстанцаў на Глыботчыне.*

*У траўні 1950 г. а. Бортніка арыштавалі. Паводле прысуду Ваеннага трыбунала ад 10 жніўня 1951-га Бортніка асудзілі "за здраду радзіме" да расстрэлу, прапанавалі зьмяніць прысуд на паняволеньня ў лагэры пад умовай адмовы ад сьвятарства. Але айцец Георгі не здрадзіў Хрыста. Ён быў расстраляны 1 лістапада 1951 году.*

*У 1991 годзе справа ўдзельнікаў Саюза пераглядалася, у рэабілітацыі ім адмоўлена.*



**Сьвятар:** Дабраслаўлёны Бог наш спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

Уладару нябёсны, Уцяшыцелю, Духу ісьціны, што ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і Жыцьцядацелю, прыйдзі і ўсяліся ў нас і ачысьці нас ад ўсяго благога і збаў, Добры, душы нашы.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. *(тройчы)*

Найсьвяцейшая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш , каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

**Чытальнік:** Госпадзе, памілуй. *(12 разоў)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Прыдзіце, паклонімся Ўладару нашаму Богу.

Прыдзіце, паклонімся і прыпадзём да Хрыста, Уладара нашага і Бога.

Прыдзіце, паклонімся і прыпадзём да самаго Хрыста, Уладара і Бога нашага.

### Псальма 142

Госпадзе, пачуй малітву маю, уваж маленьню майму па праўдзе Тваёй; пачуй мяне па праўдзе Тваёй і не ўваходзь у суд з рабом Тваім, бо не апраўдаецца прад Табою ніводзін жывы.

Вораг перасьледуе душу маю, затаптаў у зямлю жыцьцё маё, прымусіў мяне жыць у цемры, як даўно памерлых, і засмуціўся ўва мне дух мой, зьнямела ўва мне сэрца маё. Прыгадваю дні мінулыя, думаю пра ўсе дзеі Твае, разважаю пра дзеі рук Тваіх, працягваю да Цябе рукі мае; душа мая - да Цябе, як перасохлая зямля. Хутчэй пачуй мяне, Госпадзе: дух мой зьнемагае; не хавай аблічча Твайго ад мяне, каб я не спадобіўся тым, што ў магілу ідуць. Дай мне рана пачуць ласку Тваю, бо я на Цябе спадзяюся. Пакажы мне, Госпадзе, дарогу, па якой мне ісьці, бо да Цябе я ўзношу душу маю. Вызвалі мяне, Госпадзе, ад ворагаў маіх; да Цябе прыбягаю. Навучы мяне выконваць волю Тваю, бо Ты - Бог мой; Дух Твой добры вядзе мяне ў зямлю праўды. Дзеля імя Твайго, Госпадзе, ажыві мяне; дзеля праўды Тваёй выведзі зь нягоды душу маю і зь літасьці Тваёй зьлічы ворагаў маіх, і загубі ўсіх, што ўціскаюць душу маю, бо я - Твой раб.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя, слава Табе, Божа. *(тройчы)*

Бог - Госпад, і зьявіўся нам; дабраслаўлёны той, хто ідзе ва тмя Госпада.

**Верш 1:** Спавядайцеся Госпаду, бо Ён добры, бо на вякі літасьць Ягоная.

Бог - Госпад, і зьявіўся нам; дабраслаўлёны той, хто ідзе ва тмя Госпада.

**Верш 2:** Абышоўшы абступілі мяне, імём Госпада супрацьстаяў я ім.

Бог - Госпад, і зьявіўся нам; дабраслаўлёны той, хто ідзе ва тмя Госпада.

**Верш 3:** Не памру, а жыць буду, і паведамлю аб справах Госпада.

Бог - Госпад, і зьявіўся нам; дабраслаўлёны той, хто ідзе ва тмя Госпада.

**Верш 4:** Камень, якім пагрэбавалі будаўнікі, зрабіўся галавой вугла; ад Госпада быў ён, і дзівосным ёсьць у вачах нашых.

Бог - Госпад, і зьявіўся нам; дабраслаўлёны той, хто ідзе ва тмя Госпада.



**Трапар, тон 4:** У любові да Хрыста і Радзімы набожнымі бацькамі выхаваны, сьвятамучанік Георгі, суродзічу свайму, сьвятому Мяркуру Смаленскаму, пераймаючы, зброю зямную ў рукі ўзяць мусіў, каб ад ворагаў народ свій бараніць годна. А потым, Хрыста любячы і сьвятым Ягоным пераймаючы, у час выпрабаваньня крывавага, сьвятарскі крыж узяў і прынёсшы сябе, як сьвятую ахвяру, за шчасьця народу беларускага, у сьвятая сьвятых увайшоў, дзе зараз цешысься разам з анёламі. Дык цяпер, прад пасадам Хрыста прадстоячы, малі Яго, ойча сьвяты, каб збавіў народ беларускі і падаў яму мір і вялікую міласьць.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Багародзічны, тон 2:** У малітвах няспынная Багародзіца і ў абароне нязьменая спадзяваньня магіла і сьмерць ня вытрымалі. Бо як Маці Жыцьця да жыцьця прыставіў той, хто ўсяліўся ва ўлоньня заўсёды дзявочае.

## Псальма 50

Памілуй, Божа, зь мяне ў вялікай ласцы Тваёй, і ў мностве шчадротаў Тваіх загладзь беззаконьні мае! Адмый мяне шматкроць ад беззаконьня майго, і ад грэху майго ачысьці мяне: бо беззаконьне маё я ўсьведамляю, і грэх мой заўсёды перада мною. Табе, Табе аднаму я зграшыў і прад вачыма Тваімі благое ўчыніў: таму справядлівы Ты будзеш у прысудзе Тваім, і чысты ў судзе Тваім. Вось, я ў беззаконьні зачаты, і ў грэху маці мая нарадзіла мяне. Вось, палюбіў Ты праўду ў сэрцы і ўліў у мяне тайную мудрасьць. Акрапі мяне ісопам, і ачышчуся: абмый мяне, і бялей за сьнег адбялюся. Дай мне ўцеху пачуць і радасьць, і ўзрадуюцца косьці, Табою паламаныя. Адвярні аблічча Тваё ад грахоў маіх і загладзь усе беззаконьні мае. Чыстае сэрца ўмацуй ува мне, Божа, і дух справядлівы аднаві ўва мне. Не адкінь мяне ад аблічча Твайго і Духа Твайго Сьвятога не адбірай у мяне. Вярні мне радасьць збавеньня Твайго, і Духам Уладным мяне падтрымай. Я навучу беззаконцаў дарогам Тваім, і бязбожныя да Цябе навернуцца. Вызваль мяне ад крывавасьці, Божа, Божа ратунку майго; і язык мой уславіць праўду Тваю. Госпадзе!

адкрый вусны мае, і вусны мае прагалосяць славу Табе: бо калі б ахвяры Ты пажадаў, я даў бы яе; цэласпаленьне Табе не падабаецца. Ахвяра Богу - дух упакораны; сэрца ўпакоранае і зьміранае Бог ня зьнішчае. Ушчасьліві, Госпадзе, добрай воляй Тваёю Сіён, і хай паўстануць муры Ерусалімскія. Тады ўпадабаеш Ты ахвяру праўды, прынашэньні і цэласпаленьні; тады пакладуць на алтар Твой цялят.

## КАНОН СЬВЯТАМУЧАНІКУ ГЕОРГІЮ БОРТНІКУ.

### Песьня 1

**Ірмас:** Прыходзьце, людзі, засьпяваем песьню Хрысту Богу, падзяліўшаму мора, і адукаваўшаму людзей, таксама вызваліўшаму з рабства Егіпецкага, бо Ён улавіўся.

**Прысьпеў:** Славім цябе, сьвятамучанік Георгі, і шануем сьвятую памяць тваю, бо ты моліш за народ беларускі Хрыста Бога нашага.

Набожнымі бацькамі выхаваны, сьвятлом Хрыстовым адукаваны, сьвятамучанік слаўны Георгі, малітвамі тваімі дабрадзейнымі, душу маю зьнямоглую ўздымі, ды асьпяваем цябе годна.

Адукаваны любоўю Хрыстовай да Бога, бацькоў і Радзімы, сьвятому Мяркуру Смаленскаму юнаком пераймаць пачаў слаўна і, зброю зямную ўзяўшы, ад паганаў чырвоных сьвятую Беларусь бараніў годна.

З малітвай Хрыстовай на вуснах, і з Запаветамі Ягонымі ў сэрыцы мужным абаронцай айчыны выявіў сябе ты. Сяброў асьвятляў любоўю, бацькоў умацоўваў павагай і на шлях да нябёсаў выйшаў кіруемы Госпада воляй.

**Богародзічны:** Бога ад Цябе нарадзіўшагася невымоўна, бо шлюбу Ты неспазнала, існаваўшага прадстагодзьдзяў і раней усялякага стварэньня, таму мы Цябе вызнаем сапраўды Богародзіцай Усячыстай.

### Песьня 3

**Ірмас:** Зацьвердзі нас у Табе, Госпад, дрэвам забіўшы грэх, і страх да Цябе ўкарэні ў сэрцах асьпяваючых Цябе.



Любоў Хрыстову спавядаючы, ад дзяцінства да служэньня Богу імкнуўся ты, ойча Георгі, бацьку свайму дапамагаючы і ад вышыняў адукоўваючыся нявымоўна. Бо служэньня сьвятарскае Госпаду – сьвятое пакліканьня і крыж усяслаўны.

Жыцьцё твае сьвята, і словы напоўненыя праўдай Ўсявышняга, усяслаўна выхаваліся ў сэрцы тваем беларускам, прагнуўшам праўдзівага богабачаньня. Толькі прад Госпадам страх меў ты і толькі Яго шляхамі крочыў.

Разважаў богамудра ты, ойча дабраслаўлёны, аб справах зямных і нябёсных. Веры праваслаўнай абаронцам заўсёды перабываючы.

**Богародзічны:** Ад сьмерці розум наш вызваліла, нарадзіўшы праўдзівую Безсьмяротнасьць, і вопратку нам сшыла нятленную, Дзева, нараджэньням Тваім.

**Сядальны, тон 3:** Боскім Духам адукаваны, жорсткасьць катаў адвагай сьвятарскай ты, сьвятамучанік Георгі, слаўна перамог; і, перашоўшы спакусаў бездань, прыстані боскай дасягнуў праўдзіва, ойча звышгодны Георгі. Цяпер прад пасадам Госпада прадстоячы, малі Хрыста Бога нашага дараваць Радзіме тваёй і народу яе вялікую міласьць.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Кожны жадае выратавацца, таму праўдзіва і прыбягае да сьвятога пакрову Твайго, бо няма абароны лепш чым пакроў Твой, Богародзіца, пакрываючы душы нашыя.

**Крыжабогародзічны:** Жазло моцы атрымаўшы, крыж Сына твайго, Богародзіца, ім перамагаем ворагаў палкі, любоўна ўсяшануючы Цябе няспынна.

**Дыякан:** Памілуй нас, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і памілуй.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

**Дыякан:** Яшчэ молімся за богалюбнага Сьвяцейшага Ўсяленскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)* і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

Яшчэ молімся за яго (яе) міласьць ... *(імя галавы дзяржавы),* за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся за слугу Божага (Божую, слугаў Божых)... *(імёны),* каб добры і міласэрны Бог наведаў яго (яе, іх) і дараваў яму (ёй, ім) спакойнае жыцьцё, здароўе, посьпех у кожнай добрай справе, і каб адпусьціў яму (ёй, ім) ўсе ягоныя (ейныя, іхнія) правіны вольныя і міжвольныя.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

Яшчэ молімся за ўсіх тут прысутных людзей, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня, за ўсіх братоў і сёстраў нашых, і за ўсіх праваслаўных хрысьціянаў.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

**Сьвятар:** Бо Ты міласьцівы і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Трапар, тон 4:** У любові да Хрыста і Радзімы набожнымі бацькамі выхаваны, сьвятамучанік Георгі, суродзічу свайму, сьвятому Мяркуру Смаленскаму, пераймаючы, зброю зямную ў рукі ўзяць мусіў, каб ад ворагаў народ свій бараніць годна. А потым, Хрыста любячы і сьвятым Ягоным пераймаючы, у час выпрабаваньня крывавага, сьвятарскі крыж узяў і прынёсшы сябе, як сьвятую ахвяру, за шчасьця народу беларускага, у сьвятая сьвятых увайшоў, дзе зараз цешысься разам з анёламі. Дык цяпер, прад пасадам Хрыста прадстоячы, малі Яго, ойча сьвяты, каб збавіў народ беларускі і падаў яму мір і вялікую міласьць.

## Песьня 4

**Ірмас:** Пачуем Цябе, Госпад, слаўнае Тваеназіраньня, і



ўсяславім, Чалавекалюбчы, няасяжную сілу Тваю.

Апяваем твой розум богамудры, звышгодны ойча Георгі, бо у час выпрабаваньня цяжкага не аб ратаваньні цела ўласнага думаў ты, а аб узмацьненьні і збаўленьні народа беларускага. У выбары сваім звышгодным айцам зямлі Беларускай пераймаючы.

Сьвятымі айцамі дабраслаўлёны, на Беларусь павярнуўся ты. Каб крыж сьвятарства прыняўшы, стада свае зброяй духоўнай абараняць годна. Служэньня сьвятарскае вышей уласнага жыцьця меў ты, ойча сьвяты, як сьветач, ў цемры палону паганскага, стаду свайму праўдзівы шлях асьвятляючы.

Як Майсей народ Ізраільскі, ты, ойча звышгодны, жадаў народ беларускі з палону маскальскага вызваліць. І як прад Майсеям мора Чырвонае, так прад стадам тваім паганства чырвонае морам паўстала, а войска савецкае – як калесніцы фараонавы, што літасьці няведалі. Але крыжом, Богам табе дадзеным, як жазлом Майсей, шлях выратаваньня народу беларускаму адчыніў ты. Цяпер, прад усявышейшым алтаром служачы, малі Хрыста Бога нашага аб дабрабыце і шчасьці зямлі сьвятой Беларускай.

**Богародзічны:** Асьвяці, Усячыстая, цемру душы маёй сьвятлом Тваім, як Сьвятло нарадзіўшая, Адзінага ў Тройцы.

## Песьня 5

**Ірмас:** Сьвятла падаўца, і стагодзьдзяў творца, Госпад, у сьвятле Тваіх Запаветаў адукуй нас, бо апрача Цябе іншага Бога няведаем.

Багацьця і славу сьвецкую, доўгае жыцьцё і спачын мірны – усё на алтар служэньня паклаў ты, сьвятамучанік Георгі. Як пастыр добры, браў на сябе ўсе скрухі ўсіх патрабуючых, не спыняючысь прад нябясьпекай жыцьця ўласнага.

Жазлом веры Хрыстовай адганяў спакусы паганскія, а моцью любові – ўмацоўваў адзінства стада свайго. Нядзеяй напаўняў упаўшых у адчаі, моцью – зьнямоглых, а праўдай – спраглых.

Вызваленьня Радзімы ад палону паганскага прагнуўшы, вяроў праўдзівых на бой ахвярны дабраслаўляў годна. І сам,

звышгодны ойча Георгі, наперадзе крочыў з сьвятым крыжом беларускім.

**Богародзічны:** Ты, абаронца Ўсягодная, і Надзея, і Дзяржава, і Пакроў, і Сьцяна Неразбуральная, і ва ўладарства нябёснае праўдзівы Мост.

### Песьня 6

**Ірмас:** У бяздоньня грахоў сваіх кінуты, нявымоўную міласэрнасьць Тваю клікаю: з бездані сьмяротнай, Госпадзі, ўздымі мяне.

Ахвярай і ахвярнікам ты быў адначасна, Богу сябе ахвяраваўшы дзеля праўды веры, ойча звышгодны Георгі, выканаўшы годна сьвятарства твайго служэньня. За стада свае жыцьцё паклаў ты, верны Евангельскім запаветам.

Прад катам чырвоным бяздумным, узброяным д'ябальскай сілай, страху невызнаў ніколі. Зброю вышейшую ўзяў ты: праўду, любоў і надзею. Вераю непераможнай – ворага зло перамог ты, звышгодны ойча Георгі.

Праз веру і мужнасьць сьвятую, у вечную славу пайшоў ты, звышгодны ойча Георгі, цяпер, прад пасадам Хрыстовым, вымалі наша збаўленьня ад бездані грахоўнай.

**Богародзічны:** Узяўшага грахі сусьвету ўсяго, Усячыстая, Хрыста зачала бязгрэшна, таму няспынна малі аб прабачэньні грахоў слугам Тваім.

**Кандак, тон 4:** Бацькамі, што Якіму і Ганьне пераймалі, народжаны быў ты. Ад дзяцінства прасьвятлёны зьзяньням Хрыстовым. У гадзіну выпрабавальную крыж сьвятарства прыняўшы, прыкладам дабрадзейнасьці і набожнасьці быў ты, ойча звышгодны Георгі, змагаючыся з чырвонай навалай, прапаведаваў Хрыста бязстрашна. Мучаніцкай тваёй крывёю ты ўзмацніў зьнямоглых і шлях паказаў да вызваленьня. За гэта вянцом пераможным, Хрыстос цябе каранue, а мы славу цябе сьпяваем няспынна: "Радуйся, Царквы Беларускай столп непахістны!"

**Ікас:** Ты, дабраслаўлёны, жыў на зямлі набожна., абвяшчаючы невымоўныя таямніцы Боскія, і натхняючы нас сьпяваць: "Радуйся, бо дзякуючы табе хмара паганская над



Радзімай нашай зьменшылася, і зазьзяла сонца дзеля жывучых у Запаветах Госпада. Радуйся, годны слуга Боскі. Радуйся, бо верай перамог ката чырвонага. Радуйся, добра казаўшы аб славе Госпада. Радуйся, атрымаўшы вянец мучаніка і перабываючы ў прысутнасьці Сьвятой Тройцы. Радуйся, бо праз цябе праўда зазьзяла. Радуйся, зямлі Беларускай вечная слава.

**Дыякан:** Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, Найдабраслаўлёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

**Людзі:** Табе, Госпадзе.

**Сьвятар:** Бо Ты Ўладар сьвету і Збавіцель душаў нашых, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Кандак, тон 6:** Сьвяты ойча Кірыла, настаўнік наш, ты, быццам другі Златавусны, зазьзяў сьветлым вучэньням тваім і тым, што сядзелі ў цемры, сьвятло Боскай навукі прынёс; з пакорай просім цябе: малі Хрыста Бога, перад пасадам якога перабываеш, каб Ён даў супакой краіне нашай і ўсяму сусьвету, і тым, што шануюць памяць тваю, падаў аднушчэньня грахоў, удзел у вечных дабротах і багацьце свайго зьмілаваньня.

**Дыякан:** Будзьма ўважлівыя. Мудрасьць, слухайма ўважліва!

**Сьвятар:** Мір усім!

**Чытальнік:** І духу твайму.

**Дыякан:** Мудрасьць.

**Чытальнік: Пракімен, тон 4:** Дарагая ў Гасподніх вачах сьмерць сьвятых Ягоных!

**Пс. 115:6**

**Верш:** Што аддам Госпаду за ўсе дабрачынствы Ягоныя мне?

**Пс. 115:3**

**Дыякан:** Мудрасьць.

**Чытальнік:** Пасланьня да жыдоў сьвятога Апостала Паўла чытаньня.

**Дыякан:** Слухайма ўважна.

*Апостал, пач. 311*

**Сьвятар:** Мір табе, чытальнік.

**Чытальнік:** І духу твайму. Алілуя, алілуя, алілуя.

**Чытальнік:** Сьвятары Твае апранаюцца ў праўду, і сьвятыя Твае ўзрадуюцца.

**Пс. 131:9**

**Людзі:** Алілуя, алілуя, алілуя.

**Чытальнік:** Бо выбраў Гасподзь Сіён; пажадаў яго жытлом Сабе.

**Пс. 131:13**

**Людзі:** Алілуя, алілуя, алілуя.

**Сьвятар:** Мудрасьць, устаньце, будзем слухаць Сьвятое Евангельля. Мір усім.

**Людзі:** І духу твайму.

**Дыякан:** Чытаньня Сьвятога Евангельля паводле Лукаша

**Сьвятар:** Слухайма ўважна.

*Евангельля, Лк., пач. 52 (10:22-24)*

**Людзі:** Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

*(Тон* 6) Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Ацец, Сын і Дух, Тройца сьвятая, ачысьці мноства правінаў нашых.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Малітвамі Багародзіцы, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Памілуй мяне, Божа, паводле вялікай міласэрнасьці Тваёй і паводле велічы дабротаў Тваіх ачысьці беззаконьне маё.

Ня дай мне спадзявацца на людзкую помач, Усесьвятая Ўладарка, але прымі малітвы слугі Твайго: жаль і сум мяне агарнуў, не магу цярпець дэманскіх нападкаў, ня маю,



няшчасны, аховы, ні дзе ўкрыцца; пераможаны, не знаходжу суцяшэньня, апроч Цябе, Уладарка сьвету: Надзея і Заступніца верных, не пагардзі малітвамі маімі, але ўчыні карыснае мне.

## Песьня 7

**Ірмас:** Ідалу залатому богалюбчыя юнакі служыць адмовіліся, а ў пастку вагню кінутыя, арашонныя, сьпявалі: “Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых.”

У Табе кубак прымудрасьці напоўніўся дабрынёю, ойча звышгодны Георгі, і скілікаўшы казаньням годнага жыцьця твайго стада свае, кіраваў ім богамудра, і з ім, ойча сьвяты, сьпяваеш: “Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых.”

Сьмерці ад мяча ката чырвонага за Хрыста Бога нашага і стада свае ніколі не страшыўся ты, ад веры сьвятай дзеля жыцьця зямога не адмовіўся праз пакуту. Таму ў храме нябёснам з анёламі служыш, а мы з надзеяй сьпяваем табе годна: “Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых.”

Звышгодны ты, і дабро ты ёсьць праўдзівае заўсёды, насяляеш цяпер палацы нябёсныя, дзе мучанікаў хары селяцца, дзе вусны звышгодныя сьвяваюць сутонна: “Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых.”

**Багародзічны:** Ты адзіная Богу ўсягодная, Дзева Ўсячыстая, мудра маці Сябе стварыўшаму, таму Цябе набожна клікаючы сьпяваем: “Дабраслаўлёная таксама тая, што плоцьцю Цябе нарадзіла.”

## Песьня 8

**Ірмас:** У печ вогненую да юнакоў сышоўшага, і полымя ў расу пераўтварыўшага Бога, асьпявайце справы заўсёды, і ўздымайце ва ўсі стагодзьдзя.

Справамі богадагаджальнымі рызы свае сьвятарскія ўпрыгожыў добра, сьвяты ойча Георгі, настаўнік ў маліве і каяньні; узор сына, мужа і бацькі хрысьціянскага дзеля ўсіх людзей беларускіх.

Сьвятарам беларускім прыклад выяўляў ты праўдзіва. Сьвятарстваваў набожна Хрыстову службу, а як было

патрэбна, сябе ў Яму ў ахвяру прыемную і богадагаджальную прынёс годна.

Славу мучаніцтва сьвятога прынёс ты зямле Беларускай, дык малі Хрыста Бога, каб падаў грахоў прабачэньня нам, годна шануючых памяць тваю сьвятую.

**Богародзічны:** Не пагрэбуй, Абаронца адзіная, малітвы слугаў Тваіх і ў вялікай міласьці выпрасі ў Сына Твайго і Бога нашага прабачэньня грахоў, бо багата на міласьці малітва Твая.

**Песьня 9**

**Ірмас:** Ад Бога Бога-Слова, што ў невымоўнай мудрасьці прышоў абнавіць Адама, - які ўпаў нізка, пакаштаваўшы атруту тленьня, і дзеля нас прыняў цела ад Усячыстай Дзевы, у сьпевах сутонна ўзвялічым.

Ты, у жыцьці і сьвятарстве быў слаўны, напоўнены мудрасьцю невымоўнай і сусьвет прасьвяціў любоўю да Бога і Бацькаўшчыны, пасеяў колас праўды і нарадзіў слова Духу. Праз гэта зрабіўся сьвятыняй  Сьвятой Тройцы. Таму славім цябе ўсе няспынна.

Сьвятланосьбітная твая, ойча Георгі, зазьзяе памяць над усім сусьветам, адукоўваючы душы людзей набожна. Вянцом перамогі каранаваны рукамі Хрыста Бога, сьвятлом боскім напоўніўся праўдзіва і зрабіўся малельнікам цёплым дзеля ўсіх да цябе клікаючых.

Стоячы прад пасадам Бога, заступайся, дабраслаўлёны сьвятамучанік Георгі, за тых, што з радасьцю ўшаноўваюць тваю памяць. Захавай сьвятую зямлю Беларускую ад закалотаў міжсабойных і ад ўсялякіх бедаў.

**Богародзічны:** Малітвамі Богародзіцы, Госпад, дай перамогу Царкве Тваёй над паганцамі і захавай яе ў супакоі, каб нам заўсёды славіць Цябе.

**Катавасія:** Усялякі на зямлі народжаны хай суцешыцца, адукаваны Духам. Хай сьвяткуюць бясьцялесныя хары анёльскія і ўшануюць сьвята Боскай Маці, і сьпяваюць: “Радуйся, усядабраслаўлёная Богародзіца, чыстая Заўсёды Дзева!”

Дастойна ёсьць сапраўды  называць шчасьліваю цябе, Богародзіцу, вечна дабраслаглённую і беззаганную Маці Бога



нашага. Больш годную пашаны за хэрувімаў і без параўнаньня больш слаўную за сэрафімаў, што, захаваўшы дзявоцтва, нарадзіла Бога Слова, праўдзівую Богародзіцу, Цябе мы ўзьвялічваем.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. (тройчы)

Найсьвяцейшая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш , каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Трапар, тон 6:** Памілуй нас, Госпад, памілуй нас, бо ніякага адказу не ведаем, гэтую Табе малітву як Уладыке мы, грэшныя, прыносім: памілуй нас.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Трапар, тон 6:** Госпад, памілуй нас, бо на Цябе мы спадзяваемся. Не злуйся моцна на нас, не памяні беззаконьняў нашых, але паглядзі і цяпер як міласэрны і збаў нас ад ворагаў нашых, Бо Ты ёсьць Бог наш, а мы людзі Твае, усе справа рух Тваіх, і імя Твае клічам.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Міласэрнасьці дзьверы адчыні нам, дабраслаўлёная Богародзіца, каб спадзяючыся на Цябе, мы не загінулі, але каб вызваліся праз Цябе ад бедаў, бо Ты ёсьць выратаваньня роду хрысьціянскага.

**Дыякан:** Памілуй над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і памілуй.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

**Дыякан:** Яшчэ молімся за богалюбнага Сьвяцейшага Ўсялнскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)* і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

Яшчэ молімся за слугу Божага/Божую ...*(гмя),* каб добры і міласэрны Бог наведаў яго/ яе/іх і дараваў яму/ёй/ім спакойнае жыцьцё, здароўе, посьпеху кожнай добрай справе, і каб адпусьціў яму/ёй/ім усе ягоныя/ейныя/іхнія правіны вольныя і міжвольныя.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

Яшчэ молімся Госпаду Богу нашаму, каб Ён пачуў голас маленьняў нас, грэшных, і зьмілаваўся над слугою сваім/сваёю/слугамі сваімі... *(імя),* захаваў яго/яе/іх ад усякага суму, бяды, гневу і патрэбы, і ад усякае хворасьці душэўнае і цялеснае, і дараваў яму/ёй/ім здароўе і даўгалецьце. Скажам усе разам: Хутка пачуй нас і памілуй.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй. *(тры разы)*

Яшчэ молімся, каб гэтаму гораду і гэтай сьвятой царкве, і ўсякаму гораду і краіне захавацца ад голаду, пошасьці, землятрусу, патопу, агню, мяча, нападу ворагаў і братабойчае вайны; і каб добры і чалавекалюбны Бог наш быў міласэрны і спагадлівы да нас, адхіліў ад нас усякую небясыіеку, што нам пагражае, вызваліў нас ад сванго справядлівага гневу і зьмілаваўся над намі.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй .*(тры разы)*

Яшчэ молімся, каб Госпад Бог пачуў голас маленьня нас, грэшных, і зьмілаваўся над намі.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй*(тры разы)*

**Сьвятар:** Выслухай нас, Божа, Збавіцелю наш, надзея ўсіх, што жывуць на зямлі, і тых, што далёка на моры, і будзь спагадлівы да нас, грэшных, і памілуй над намі. Бо Ты



міласэрны і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

## Малітва

Сьвятамучанік ойча Георгі! Ты, у жыцьці і сьвятарстве быў слаўны, напоўнены мудрасьцю невымоўнай і сусьвет прасьвяціў любоўю да Бога і Бацькаўшчыны, пасеяў колас праўды і нарадзіў слова Духу. Праз гэта зрабіўся сьвятыняй Сьвятой Тройцы. Вянцом перамогі каранаваны рукамі Хрыста Бога, сьвятлом боскім напоўніўся праўдзіва і зрабіўся малельнікам цёплым дзеля ўсіх да цябе клікаючых.

Стоячы прад пасадам Бога, заступайся, дабраслаўлёны сьвятамучанік Георгі, за тых, што з радасьцю ўшаноўваюць тваю памяць. Захавай сьвятую зямлю Беларускую ад закалотаў міжсабойных і ад ўсялякіх бедаў. Амін.

**Сьвятар:** Мудрасьць.

**Людзі:** Больш годную пашаны за хэрувімаў І без параўнаньня больш слаўную за сэрафімаў, што, захаваўшы дзявоцтва, радзіла Бога-Слова, існую Багародзіцу, Цябе мы ўзьвялічваем.

**Сьвятар:** Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

**Людзі:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін. Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй. Ойча, дабраславі.

**Сьвятар робіць водпуск:** Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстае свае Маці, сьвятых і баганосных айцоў нашых, і сьвятамучаніка Георгія,, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец[1].

**Людзі:** Амін.

[1] Альбо водпуск адпаведнага дня.

**1 лістапада**

# СЛУЖБА СЬВЯТАМУЧАНІКУ ГЕОРГІЮ (БОРТНІКУ)

## НА ВЯЧОРНЯЙ

### На “Госпада клічу”, вершыры на 6, тон 1

Богамудры звышгодны, Гэоргі, чырваньню крыві ўласнай, сьвятарскія рызы свае ўпрыгожыў ты годна: моцны ў змаганьні, бо набожнасьць у моцы, і ўсяхвальна ў славу боскую радасна перашоў ты, і цяпер маліся, каб Госпад падаў душам нашым мір і вялікую міласьць. (2)

Раней ахвяру бязкроўную, як сьвятар праўдзівы, богадобрую ўсяславу, пасьля таксама ўсяплодную і прыемную ахвяру, сваёй крывёй, як сьвятамучанік усягодны Хрысту прынёс слаўна, Яго ж малі аб шануючых цябе. (2)

Мучанікаў хары, Хрыстос Ойча, прывёў Ты, навукай і запаветамі Сваімі, адукоўвая і выхоўвая, і як вобраз богамудры, Цябе самога прапаноўваючы. З імі молімся, падаць душам нашым мір і вялікую міласьць. (2)

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Багародзічны:** У буры грахоў сканаючы, да ціхай прыстані Тваіх маленьняў, Усячыстая Багародзіца, прыбягаю, клікаю Цябеб выратуй мяне, дзяржаўную руку Тваю працягні да слугі Твайго, Усягодная.

**Крыжабагародзічны:** На крыжы бачыўшы Сына і Бога твайго, і на пакуты Яго гледзячы, казала плачучы Маці Чыстая: Боляча мне, Сын мой Усяслалодкі, што гэтыя пакуты прымаеш бязвінна, Слова Боскае, дзеля выратаваньня сусьвету.

### Вершыра саматонныя, тон 6

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Сьвятаром праўдзівым, да самай сьмерці сваёй зьяўляўся ты, сьвятамучанік Георгі, бо сьвятарства Боскага невымоўную таямніцу зьдзясьняў набожна, кроў сваю праліў за Хрыста Бога, і ў ахвяру богапрыемную сябе прынёс ты. Тым права



маючы прадстаяць прад пасадам Госпада, няспынна малі Яго аб шчасьці Радзімы тваёй – зямлі Беларускай і аб шануючых памяць тваю годна, каб вызваліся ад усяго злога і атрымалі мір і вялікую міласьць.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Багародзічны:** Бога з Цябе ўвасобіўшагася невымоўна, Багародзіца Дзева, малі аб збаўленьні душаў нашых.

**Крыжабагародзічны:** Бачыўшы Цябе ўкрыжаваным, Хрысьце, Цябе нарадзіўшая клікала: “Што за невядомую бачу таямніцу, Сын мой, жыцьця падаўца, на дрэве памірае плоцьцю ўкрыжаваны.”

*Уваход, Пракімен дня і чытаньня сьвята.*

### Прыпавясьцяў чытаньня

Шчаслівы чалавек, што знайшоў мудрасьць, чалавек, што розум набыў, бо яе набыцьцё лепшы ад набыцьця срэбра, і кштоўней золата падобны набытак. Яна каштоўней перлінаў, нічога з жаданага не параўнальна з мудрасьцю. Час доўгі ў яе правай руце, і ў левай руце багацьця і слава.

**Прып. 3:13-16**

### Мудрасьці чытаньня

Праведнік, паміраючы прадчасна, знаходзіць супакой, бо годная старасьць не ў багацьці гадоў і не вымяраецца лікам іх. Розум чалавечы не ў сівых валасах, і век старасьці – гэта жыцьцё ўсячыстае. Ён спадабаўся Богу і ён палюбіў яго, а што жыў паміж грэшнікамі, то і перанёс яго. Выхоплены ён, каб зло не зьмяніла розуму ягонага альбо каб хітрасьць не падманула душы ягонай. Бо чад зла паглынае дабро, і жаданьняў бура зьменівае розум чысты. За час кароткі дасканалым зрабіўшысь, ён выканаў шматгодзьдзя., бо душа ягоная Госпаду спадабалася, таму і забраў Ён яго хутка ад зла сусьвету зямнога. Людзі гэта бачаць, але не разумеюць, ім гэта і ў розум не прыходзіць тое, што міласьць і міласэрнасьць – дзеля абраных Ягоных і клопат – дзеля сьвятых Яго. Праведнік спачылы асуджывае жывых грэшнікаў; а юнацтва, якое дасканаласьці хутка дасягнула, - няправеднага шматгадовую старасьць. Бо яны канец мудра бачаць, але не разумеюць, што

Госпад вырашыў аб ім і навошта яго забясьпечыў. Бачаць і зьневажаюць, але Госпад з іх пасьмяецца. І пасьля гэтага трупам зьняважаным зробяцца, пагардай назаўжды сярод памёршых, бо Ён магутна іх кіне, анямеўшых, ператрусіць аж да іх падмуркаў, і зьнішчаны яны будуць канчаткова; перабываць будуць у пакуце, і памяць аб іх сатрэцца. У дзень судны, калі грахі іх пералічываць будуць, яны прыдуць жахаясь, і беззаконьня іх, на супраць іх паўстаўшы, абвінаваўцамі іх будуць.

Тады выдзе праведнік з сьмеласьцю вялікай і стане прад крыўднікамі сваімі, што годную працу яго за нішто мелі. Яны ўздрыгнуўшы, напоўняцца жахам жахлівым і зьдзівуюцца неспадзяваным выратаваньням. Яна, каючыся, прамовяць адзі да аднога і, у хваляваньні духа стагнаўшы, прамовяць: “Гэта той, якога мы калісьці зьнішчалі і з сьмяяліся з якога калісьці. Якія ж іы былі дурныя! Жыцьцё ягонае лічылі бязглуздай, а сьмерць – нягоднай. Як жа ён залічаны да сыноў Боскіх, і сярод сьвятых ён перабывае.”

**Мудр. 4:7-20, 5:1-5**

### Вершоўны на вершыры, саматонныя, тон, 6

Крывёй уласнай свае рызы сьвятарскія абагрыўшы, увашоў ты ў сьвятое сьвятых, сьвяты ты быў, ойча Георгі, усяхвальны слуга Боскі, і табой заўсёды Царква Беларуская ўпрыгожваецца годна, мучаніцтвам тваім сьвятым узмацняючысь. Таму і мы, нягоднае стада твае, сьвяткуем урачыста сьвятое сьвята твае, усягодны ойча Георгі.

**Верш:** Сьвятары Твае апранаюцца ў праўду, і сьвятыя Твае ўзрадуюцца.

**Пс. 131:9**

Набожнымі бацькамі выхаваны, Бога і Беларусь усім сэрцам любячы, праўдзівым шляхам крочыў ты, звышгодны, што да нябёснага горада прыводзіць. Праз годныя твае ранамы, ойча Георгі, ды сьвятарскае сьвятое служэньня, у яго ўвайшоў ты як пераможца сапраўдны і мучанік непераможны, і сьвятатворца сьвяты, сьпяваеш з анёламі песьню боскую: Сьвята, сьвята, сьвята Тройца адзінасутная.



**Верш:** Дарагая ў Гасподніх вачах сьмерць сьвятых Ягоных!

**Пс.115:6**

Як сьвятар, годна служыў ты Ўладару Хрысту Богу і пыносіў беззаганую ахвяру, а ў канцы ты, сьвятамучанік Георгі, прынёс Госпаду дасканалае целаспаленьня – самаго сябе, пяцярпеўшы мужна дзеля любові Ягонай і, як пастыр добры, “аддаў жыцьця свае за авечак”. Як пастыр праўдзівы і верны сын зямлі Беларускай, ты маліўся няспынна: “Ойча, зьбяражы краіну нашую – Беларусь Сьвятую, дай мір народу яе і ад палону варожага вызвалі!” Дык і сёньня, дабраславены Георгі, прадстоячы прад пасадам Госпада, маліся за Радзіму нашую – Беларусь Дабраслаўлёную і народ яе шматпакутны.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Быццам сонца, зазьзялі добрыя справы твае на нябёсах і зямлі, дагаджальнік Хрыстовы, дабраслаўлёны сьвятамучанік Георгі. Як сын зямлі Беларускай, ты добра яе зброяй зямной абараняў, а потым, зброяй усямоцнай апаясаўшыся, праўдзіва веру Хрыстову ў час выпрабавальны народу свайму прапаведываў. Апосталам і пастырам Хрыстовым пераймаючы, сябе ў ахвяру за народ свій прынёс. Малі ж Яго цяпер, дабраслаўлёны ойча Георгі, у гэтае сьвята твае сьвятое за збаўленьня ўсіх, якія з любоўю шануюць памяць мучаніцкай сьмерці тваёй.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Багародзічны, тон 4:** Зьзяньням Духа ўсячыстага, мае думкі асьвяці, як нарадзіўная Хрыста, нявымоўна беззаконьня чалавечыя шчадротамі скасоўваючага; малітвамі Тваімі ўсямоцнымі зьнішчы крыніцу злых запалаў маіх, і зрабі годным мяне прычасьнікам быць жыцьця вечнага.

**Крыжабагародзічны:** На крыжы Цябе пабачыўшы прыцвячаным, Госпад, Дзева і Маці Твая пакутвала, што сабор беззаконны няпраўдзіва карае Цябе, нягледзячы на ўсе справы Твае добрыя, але невымоўна і ўсявяліка слава ўзыходжаньня Твайго.

**Трапар, тон 4:** У любові да Хрыста і Радзімы набожнымі бацькамі выхаваны, сьвятамучанік Георгі, суродзічу свайму,

сьвятому Мяркуру Смаленскаму, пераймаючы, зброю зямную ў рукі ўзяць мусіў, каб ад ворагаў народ свій бараніць годна. А потым, Хрыста любячы і сьвятым Ягоным пераймаючы, у час выпрабаваньня крывавага, сьвятарскі крыж узяў і прынёсшы сябе, як сьвятую ахвяру, за шчасьця народу беларускага, у сьвятая сьвятых увайшоў, дзе зараз цешысься разам з анёламі. Дык цяпер, прад пасадам Хрыста прадстоячы, малі Яго, ойча сьвяты, каб збавіў народ беларускі і падаў яму мір і вялікую міласьць.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны, тон 4:** Ад стагодзьдзяў патаемная і Анёлам невядомая таемніца, праз Цябе, Богародзіца, паказана жывучым на зямлі, - Бог, увасобіўшыйся ў нязьлітнам яднаньні двух сутнасьцяў, і дзеля нас добраахвотна што прыняў Крыж, - ім Ён уваскрэсіў Адама першароднага і выратаваў ад сьмерці душы нашы.

## НА РАНІШНЯЙ

*На “Бог Господ:” сьпяваем:*

**Трапар, тон 4:** У любові да Хрыста і Радзімы набожнымі бацькамі выхаваны, сьвятамучанік Георгі, суродзічу свайму, сьвятому Мяркуру Смаленскаму, пераймаючы, зброю зямную ў рукі ўзяць мусіў, каб ад ворагаў народ свій бараніць годна. А потым, Хрыста любячы і сьвятым Ягоным пераймаючы, у час выпрабаваньня крывавага, сьвятарскі крыж узяў і прынёсшы сябе, як сьвятую ахвяру, за шчасьця народу беларускага, у сьвятая сьвятых увайшоў, дзе зараз цешысься разам з анёламі. Дык цяпер, прад пасадам Хрыста прадстоячы, малі Яго, ойча сьвяты, каб збавіў народ беларускі і падаў яму мір і вялікую міласьць.

*Пасьля першай кафізмы:*

**Сядальны, тон 3:** Морам спавяданьня веры, спакусы згасіў ты славаслаўям, выкрывая паганскае бязбожжа, і ўсяспаленьня боскае прыняўшы, праменьнямі цудаў сусьвет асьвятляеш,



ойча звышгоды Георгі. Малі Хрыста Бога падаць нам вялікую міласьць. *(два разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Боскай скініяй зьяўлялася Ты дзеля Слова, адзіная Ўсячыстая Дзева-Маці. Мяне, больш за ўсіх грэхамі забруднёнага, ачысьці боскімі водамі малітваў Тваіх, падаючы, Усячыстая, вялікую міласьць.

*Пасьля другой кафізмы:*

**Сядальны, тон 4:** Як зазьзяўшае сонца сьвятло, зьзяеш, звышгодны, усяму сусьвету сьвятлом навукі тваёй, богавусны Георгі, сьвятланосная мучанікаў хвала. *(два разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Усячыстыя рукі Твае, Дзева-Маці, працягні, пакрой спадзяваючыхся на Цябе, і Сына свайго малі: Усім падай, Хрысьце, міласьці Твае.

*Пасьля “Хваліце імя Госпада:”*

**Прысьпеў:** Славім цябе, сьвятамучанік Георгі, і шануем сьвятую памяць тваю, бо ты моліш за народ беларускі Хрыста Бога нашага.

### Псальма абраная

Дабро ёсьць - славіць Госпада і сьпяваць імю Твайму, Усявышні, абвяшчаць раніцай ласку Тваю і праўду Тваю ўначы.

**Пс 91:2–3**

Вялікі Гасподзь і праслаўлены вельмі ў горадзе Бога нашага, на сьвятой гары Ягонай.

**Пс 47:2**

Род у род будзе хваліць дзеі Твае і абвяшчаць магутнасьць Тваю.

**Пс 144:4**

Буду казаць пра моц страшных дзеяў Тваіх, і я буду абвяшчаць веліч Тваю.

**Пс 144:5**

Будуць абвяшчаць памяць вялікай даброці Тваёй і распавядацьмуць праўду Тваю.

**Пс 144:7**

Господь Гасподзь дасьць сілу народу Свайму; Гасподзь дабраславіць народ Свой мірам.

**Пс 28:11**

Хай радуюцца сьвятыя ў славе, хай сьпяваюць на ложках сваіх.

**Пс 149:5**

А ўсе, хто на Цябе спадзяецца, будуць радавацца вечна; і Ты будзеш іх асланяць; і будуць хваліцца Табою тыя, хто любіць імя Тваё.

**Пс 5:12**

Такі род усіх, што шукаюць Яго, шукаюць аблічча Твайго, Божа Якаваў!

**Пс 23:6**

Якія ўзьнёслыя для мяне намеры Твае, Божа, і як многа іх лікам!

**Пс 138:17**

Ці ж палічу іх, калі іх больш, чым пяску.

**Пс 138:18а**

Ведайце, што Гасподзь ёсьць Бог, што Ён стварыў нас, і мы - Ягоныя, Ягоны народ і авечкі паствы Ягонай.

**Пс 99:3**

Пра ласкі Твае, Госпадзе, буду сьпяваць вечна, з роду ў род абвяшчаць праўду Тваю вуснамі маімі.

**Пс 88:2**

А ласка Гасподняя зьвеку й давеку тым, хто баіцца Яго.

**Пс 102:17**

Хто баіцца Госпада! спадзявайся на Госпада; Ён - нам дапамога і шчыт.

**Пс 113:19**

Сьпявайце радасна Богу, цьвярдыні нашай; усклікайце Богу Якава!

**Пс 80:2**

Мы парадуемся выратаваньню твайму, і ў імя Бога нашага падымем сьцяг.

**Пс 19:6а**



Гасподзь - сіла народу Свайго і ратавальная абарона памазанца Свайго.

**Пс 27:8**

З Богам мы выявім сілу; Ён скіне ворагаў нашых.

**Пс 59:14**

Госпадзе! сілаю Тваёю радуецца цар, і з Твайго ратаваньня цешыцца бясконца.

**Пс 20:2**

Хваліцьмемся Богам штодня, і імя Тваё будзем славіць вечна.

**Пс 43:9**

Зямля дала плод свой: хай дабраславіць нас Бог, Бог наш. Хай дабраславіць нас Бог, і хай збаяцца Яго ўсе межы зямлі.

**Пс 66:7–8**

Ратуй нас, Госпадзе, Божа наш, зьбяры нас спаміж народаў, каб мы славілі сьвятое імя Тваё, хваліліся Тваёю славаю.

**Пс 105:47**

Дабраславёны Гасподзь, Бог Ізраілеў, спрадвеку і навечна! І хай скажа ўвесь народ: амін!

**Пс 105:48**

*Пасьля паліялея:*

**Сядальны, тон 8:** Умацаваны моцью ўсятворчай, і ветразем кіруемы крыжовым, лёгка буру жыцьцёвую пераадолеў, і боскай прыстані сапраўды дасягнуў ты, дабранабожнасьцю напоўнены, таксама і сябе Ўладару ўсіх прынёс, як слуга добры. Таму, звышгодны Георгі, малі Хрыста Бога, прабачэньня грахоў падаць народу беларускаму, што памяць тваю з любоўю шануе. *(два разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Багародзічны: У палон шматпакутны патрапіў, ворагаў бачных і нябачных, бурай гнаны нязлічоных грахоў маіх; і як да цёплага супакою і пакрову майму, Чыстая, да прыстанку Тваёй дабрыні прыбягаю. Таму, Усячыстая, да Народжанага Табой без семяні, няспынна маліся аб усіх слугах Тваіх, ад сэрца молячых Цябе, Багародзіца Ўсячыстая, каб Сын Твой і

Бог наш грахоў прабачэньня літасьціва падаў, асьпяваючым годна славу Тваю.

*Сьцяпяны, 1 антыфон 4 тону*

**Пракімен:** Дарагая ў Гасподніх вачах сьмерць сьвятых Ягоных.

**Пс. 115:6**

**Верш:** Што аддам Госпаду за ўсе дабрачынствы Ягоныя мне.

**Пс. 115:3**

*Евангельля: Лк., пач. 67 (12:32-40)*

*Пасьля псальмы 50*

**Вершыра, тон 4:** Сасудам Духа Сьвятога зьяўляўся ты, душу ачысьціўшы ад запалаў, годна боскае памазаньня прыняўшы. Абаронцам і сьвятаром ты быў народу беларускаму, і настаўнікам людзей богамудрых, і мучанік непераможны, дзеля Беларусі пакуту прыняўшы, і адвагу Хрыстову паказаўшы, сьвятамучанік ойча Георгі.

## Канон, тон 2

### Песьня 1

**Ірмас:** Прыходзьце, людзі, засьпяваем песьню Хрысту Богу, падзяліўшаму мора, і адукаваўшаму людзей, таксама вызваліўшаму з рабства Егіпецкага, бо Ён улавіўся.

**Прысьпеў:** Славім цябе, сьвятамучанік Георгі, і шануем сьвятую памяць тваю, бо ты моліш за народ беларускі Хрыста Бога нашага.

Набожнымі бацькамі выхаваны, сьвятлом Хрыстовым адукаваны, сьвятамучанік слаўны Георгі, малітвамі тваімі дабрадзейнымі, душу маю зьнямоглую ўздымі, ды асьпяваем цябе годна.

Адукаваны любоўю Хрыстовай да Бога, бацькоў і Радзімы, сьвятому Мяркуру Смаленскаму юнаком пераймаць пачаў слаўна і, зброю зямную ўзяўшы, ад паганаў чырвоных сьвятую Беларусь бараніў годна.

З малітвай Хрыстовай на вуснах, і з Запаветамі Ягонымі ў сэрцы мужным абаронцай айчыны выявіў сябе ты. Сяброў асьвятляў любоўю, бацькоў умацоўваў павагай і на шлях да нябёсаў выйшаў кіруемы Госпада воляй.



**Багародзічны:** Бога ад Цябе нарадзіўшагася невымоўна, бо шлюбу Ты неспазнала, існаваўшага прадстагодзьдзяў і раней усялякага стварэньня, таму мы Цябе вызнаем сапраўды Багародзіцай Усячыстай.

### Песьня 3

**Ірмас:** Зацьвердзі нас у Табе, Госпад, дрэвам забіўшы грэх, і страх да Цябе ўкарэні ў сэрцах асьпяваючых Цябе.

Любоў Хрыстову спавядаючы, ад дзяцінства да служэньня Богу імкнуўся ты, ойча Георгі, бацьку свайму дапамагаючы і ад вышыняў адукоўваючыся нявымоўна. Бо служэньня сьвятарскае Госпаду – сьвятое пакліканьня і крыж усяслаўны.

Жыцьцё твае сьвята, і словы напоўненыя праўдай Ўсявышняга, усяслаўна выхаваліся ў сэрцы тваем беларускам, прагнуўшам праўдзівага богабачаньня. Толькі прад Госпадам страх меў ты і толькі Яго шляхамі крочыў.

Разважаў богамудра ты, ойча дабраслаўлёны, аб справах зямных і нябёсных. Веры праваслаўнай абаронцам заўсёды перабываючы.

**Багародзічны:** Ад сьмерці розум наш вызваліла, нарадзіўшы праўдзівую Безсьмяротнасьць, і вопратку нам сшыла нятленную, Дзева, нараджэньням Тваім.

**Сядальны, тон 3:** Боскім Духам адукаваны, жорсткасьць катаў адвагай сьвятарскай ты, сьвятамучанік Георгі, слаўна перамог; і, перашоўшы спакусаў бездань, прыстані боскай дасягнуў праўдзіва, ойча звышгодны Георгі. Цяпер прад пасадам Госпада прадстоячы, малі Хрыста Бога нашага дараваць Радзіме тваёй і народу яе вялікую міласьць.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Багародзічны:** Кожны жадае выратавацца, таму праўдзіва і прыбягае да сьвятога пакрову Твайго, бо няма абароны лепш чым пакроў Твой, Багародзіца, пакрываючы душы нашыя.

**Крыжабогародзічны:** Жазло моцы атрымаўшы, крыж Сына твайго, Багародзіца, ім перамагаем ворагаў палкі, любоўна ўсяшануючы Цябе няспынна.

**Песьня 4**

**Ірмас:** Пачуем Цябе, Госпад, слаўнае Твае назіраньня, і ўсяславім, Чалавекалюбчы, няасяжную сілу Тваю.

Апяваем твой розум богамудры, звышгодны ойча Георгі, бо у час выпрабаваньня цяжкага не аб ратаваньні цела ўласнага думаў ты, а аб узмацьненьні і збаўленьні народа беларускага. У выбары сваім звышгодным айцам зямлі Беларускай пераймаючы.

Сьвятымі айцамі дабраслаўлёны, на Беларусь павярнуўся ты. Каб крыж сьвятарства прыняўшы, стада свае зброяй духоўнай абараняць годна. Служэньня сьвятарскае вышей уласнага жыцьця меў ты, ойча сьвяты, як сьветач, ў цемры палону паганскага, стаду свайму праўдзівы шлях асьвятляючы.

Як Майсей народ Ізраільскі, ты, ойча звышгодны, жадаў народ беларускі з палону маскальскага вызваліць. І як прад Майсеям мора Чырвонае, так прад стадам тваім паганства чырвонае морам паўстала, а войска савецкае – як калесніцы фараонавы, што літасьці няведалі. Але крыжом, Богам табе дадзеным, як жазлом Майсей, шлях выратаваньня народу беларускаму адчыніў ты. Цяпер, прад усявышейшым алтаром служачы, малі Хрыста Бога нашага аб дабрабыце і шчасьці зямлі сьвятой Беларускай.

**Богародзічны:** Асьвяці, Усячыстая, цемру душы маёй сьвятлом Тваім, як Сьвятло нарадзіўшая, Адзінага ў Тройцы.

**Песьня 5**

**Ірмас:** Сьвятла падаўца, і стагодзьдзяў творца, Госпад, у сьвятле Тваіх Запаветаў адукуй нас, бо апрача Цябе іншага Бога няведаем.

Багацьця і славу сьвецкую, доўгае жыцьцё і спачын мірны – усё на алтар служэньня паклаў ты, сьвятамучанік Георгі. Як пастыр добры, браў на сябе ўсе скрухі ўсіх патрабуючых, не спыняючысь прад нябясьпекай жыцьця ўласнага.



Жазлом веры Хрыстовай адганяў спакусы паганскія, а моцью любові – ўмацоўваў адзінства стада свайго. Нядзеяй напаўняў упаўшых у адчаі, моцью – зьнямоглых, а праўдай – спраглых.

Вызваленьня Радзімы ад палону паганскага прагнуўшы, ваяроў праўдзівых на бой ахвярны дабраслаўляў годна. І сам, звышгодны ойча Георгі, наперадзе крочыў з сьвятым крыжом беларускім.

**Богародзічны:** Ты, абаронца Ўсягодная, і Надзея, і Дзяржава, і Пакроў, і Сьцяна Неразбуральная, і ва ўладарства нябёснае праўдзівы Мост.

**Песьня 6**

**Ірмас:** У бяздоньня грахоў сваіх кінуты, нявымоўную міласэрнасьць Тваю клікаю: з бездані сьмяротнай, Госпадзі, ўздымі мяне.

Ахвярай і ахвярнікам ты быў адначасна, Богу сябе ахвяраваўшы дзеля праўды веры, ойча звышгодны Георгі, выканаўшы годна сьвятарства твайго служэньня. За стада свае жыцьцё паклаў ты, верны Евангельскім запаветам.

Прад катам чырвоным бяздумным, узброяным д’ябальскай сілай, страху невызнаў ніколі. Зброю вышейшую ўзяў ты: праўду, любоў і надзею. Вераю непераможнай – ворага зло перамог ты, звышгодны ойча Георгі.

Праз веру і мужнасьць сьвятую, у вечную славу пайшоў ты, звышгодны ойча Георгі, цяпер, прад пасадам Хрыстовым, вымалі наша збаўленьня ад бездані грахоўнай.

**Богародзічны:** Узяўшага грахі сусьвету ўсяго, Усячыстая, Хрыста зачала бязгрэшна, таму няспынна малі аб прабачэньні грахоў слугам Тваім.

**Кандак, тон 4:** Бацькамі, што Якіму і Ганьне пераймалі, народжаны быў ты. Ад дзяцінства прасьвятлёны зьзяньням Хрыстовым. У гадзіну выпрабавальную крыж сьвятарства прыняўшы, прыкладам дабрадзейнасьці і набожнасьці быў ты, ойча звышгодны Георгі, змагаючыся з чырвонай навалай, прапаведаваў Хрыста бязстрашна. Мучаніцкай тваёй крывёю ты ўзмацніў зьнямоглых і шлях паказаў да вызваленьня. За гэта

вянцом пераможным, Хрыстос цябе каранує, а мы славу цябе сьпяваем няспынна: "Радуйся, Царквы Беларускай столп непахістны!"

**Ікас:** Ты, дабраслаўлёны, жыў на зямлі набожна., абвяшчаючы невымоўныя таямніцы Боскія, і натхняючы нас сьпяваць: "Радуйся, бо дзякуючы табе хмара паганская над Радзімай нашай зьменшылася, і зазьзяла сонца дзеля жывучых у Запаветах Госпада. Радуйся, годны слуга Боскі. Радуйся, бо верай перамог ката чырвонага. Радуйся, добра казаўшы аб славе Госпада. Радуйся, атрымаўшы вянец мучаніка і перабываючы ў прысутнасьці Сьвятой Тройцы. Радуйся, бо праз цябе праўда зазьзяла. Радуйся, зямлі Беларускай вечная слава.

## Песьня 7

**Ірмас:** Ідалу залатому богалюбчыя юнакі служыць адмовіліся, а ў пастку вагню кінутыя, арашонныя, сьпявалі: "Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых."

У Табе кубак прымудрасьці напоўніўся дабрынёю, ойча звышгодны Георгі, і скілікаўшы казаньням годнага жыцьця твайго стада свае, кіраваў ім богамудра, і з ім, ойча сьвяты, сьпяваеш: "Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых."

Сьмерці ад мяча ката чырвонага за Хрыста Бога нашага і стада свае ніколі не страшыўся ты, ад веры сьвятай дзеля жыцьця зямога не адмовіўся праз пакуту. Таму ў храме нябёснам з анёламі служыш, а мы з надзеяй сьпяваем табе годна: "Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых."

Звышгодны ты, і дабро ты ёсьць праўдзівае заўсёды, насяляеш цяпер палацы нябёсныя, дзе мучанікаў хары селяцца, дзе вусны звышгодныя сьвяваюць сутонна: "Дабраслаўлёны ёсьць Бог бацькоў нашых."

**Богародзічны:** Ты адзіная Богу ўсягодная, Дзева Ўсячыстая, мудра маці Сябе стварыўшаму, таму Цябе набожна клікаючы сьпяваем: "Дабраслаўлёная таксама тая, што плоцьцю Цябе нарадзіла."



## Песьня 8

**Ірмас:** У печ вогненую да юнакоў сышоўшага, і полымя ў расу пераўтварыўшага Бога, асьпявайце справы заўсёды, і ўздымайце ва ўсі стагодзьдзя.

Справамі богадагаджальнымі рызы свае сьвятарскія ўпрыгожыў добра, сьвяты ойча Георгі, настаўнік ў маліве і каяньні; узор сына, мужа і бацкі хрысьціянскага дзеля ўсіх людзей беларускіх.

Сьвятарам беларускім прыклад выяўляў ты праўдзіва. Сьвятарстваваў набожна Хрыстову службу, а як было патрэбна, сябе ў Яму ў ахвяру прыемную і богадагаджальную прынёс годна.

Славу мучаніцтва сьвятога прынёс ты зямле Беларускай, дык малі Хрыста Бога, каб падаў грахоў прабачэньня нам, годна шануючых памяць тваю сьвятую.

**Богародзічны:** Не пагрэбуй, Абаронца адзіная, малітвы слугаў Тваіх і ў вялікай міласьці выпрасі ў Сына Твайго і Бога нашага прабачэньня грахоў, бо багата на міласьці малітва Твая.

## Песьня 9

**Ірмас:** Ад Бога Бога-Слова, што ў невымоўнай мудрасьці прышоў абнавіць Адама, - які ўпаў нізка, пакаштаваўшы атруту тленьня, і дзеля нас прыняў цела ад Усячыстай Дзевы, у сьпевах сутонна ўзвялічым.

Ты, у жыцьці і сьвятарстве быў слаўны, напоўнены мудрасьцю невымоўнай і сусьвет прасьвяціў любоўю да Бога і Бацькаўшчыны, пасеяў колас праўды і нарадзіў слова Духу. Праз гэта зрабіўся сьвятыняй Сьвятой Тройцы. Таму славім цябе ўсе няспынна.

Сьвятланосьбітная твая, ойча Георгі, зазьзяе памяць над усім сусьветам, адукоўваючы душы людзей набожна. Вянцом перамогі каранаваны рукамі Хрыста Бога, сьвятлом боскім напоўніўся праўдзіва і зрабіўся малельнікам цёплым дзеля ўсіх да цябе клікаючых.

Стоячы прад пасадам Бога, заступайся, дабраслаўлёны сьвятамучанік Георгі, за тых, што з радасьцю ўшаноўваюць

тваю памяць. Захавай сьвятую зямлю Беларускую ад закалотаў міжсабойных і ад ўсялякіх бедаў.

**Богародзічны:** Малітвамі Богародзіцы, Госпад, дай перамогу Царкве Тваёй над паганцамі і захавай яе ў супакоі, каб нам заўсёды славіць Цябе.

**Катавасія:** Усялякі на зямлі народжаны хай суцешыцца, адукаваны Духам. Хай сьвяткуюць бясьцялесныя хары анёльскія і ўшануюць сьвята Боскай Маці, і сьпяваюць: "Радуйся, усядабраслаўлёная Богародзіца, чыстая Заўсёды Дзева!"

### Сьвяцільны

Жыцьцё свае паклаў за стада сваё, ад паганаў чырвоных няславу церпячы, але ў нябёсах Хрыстос Бог каранаваў цябе вянком пераможным, дабраслаўлёны ойча Георгі, сьветач сусьветны, сьвятароў упрыгожаньня і ўсіх сьвятых пахвала.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Асьвятлі, Усячыстая, душу маю ў граху пацямнеўшую, і ад вечнага полымя і цемры вызвалі малітвамі тваімі, як з усяпашанай хвалячага веліч Тваю.

### На "хваліце" вершыры на 4, тон 4

Ад дзяцінства выхаванаму ў набожнасьці, дабрыня духоўная, звышгодны ойча Георгі, табе зазьзяла, сьвятлом адукаваўшы цябе. Ты буз прыкладам дзеля ўсіхсьвятароў, сыноў, мужоў і бацькоў беларускіх. Люстрам ўсялякай дабрадзейнасьці, узьнесшы розум да вышыняў нябёсных, каб пабачыць невымоўную дабрыню Хрыстову. Умацаваны моцью Ягонай, ты перацярпеў шматлікія белы і мукі, і цяпер, прадстоячы прад пасадам Боскім, молішся няспынна за душы нашыя. *(два разы)*

Як сьвятар беларускі ты, дабраслаўлёны ойча Георгі, упрыгожыў сябе ўсялякімі дабрадзейнасьцямі, Імкнуўшыся служыць народу свайму, узброяўся вераю і маліваю, праўдзівасьцю і нядрэмнасьцю. Як Хрыстос, ты крочыў



насустрач свайму мучаніцкаму подзьвігу і сьмерці за Хрыста і Беларусь сьвятую. Маліся цяпер за душы нашыя.

Паганы чырвоныя ўзьняліся супраць цябе, дабраслаўлёны сьвятамучанік Георгі, і казалі: "Зьнішчым яго, і згіне з памяці імя яго, і справа ягоная загіне." Кінулі ў вязьніцу цябе і катавалі жахліва, каб ад Хрыста і справы жыцьця свайго адмовіўся. На суд няправедны, як Хрыста жыды, аддалі і на сьмерць асудзілі. Але перамог ты паганаў злых сьмерцю сваёй. Славім мужнасьць тваю, звышгодны ойча Георгі, за якую атрымаў ты несьмяротны вянец.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Ад дзяцінства ў набожнасьці выхаваны, ты Хрыста і Радзіму палюбіў усім сэрцам. Ты правёў усё жыцьцё свае ў змаганьні за веру Хрыстову і Беларусь сьвятую. І, як пастыр добры, мужна сьмерць прыняў за авечак сваіх. За гэта годна каранаваны быў вянком пераможным з рук Хрыста Бога нашага. Дык малі Яго, ойча дабраслаўлёны. каб тых, якія з любоўю шануюць памяць тваю, Госпад вызваліў аб ўсіх ворагаў бачных і нябачных, ад пажаданьняў і спакусаў злога, падаў добрага адказу на судзе боскам,і збавіў душы нашыя.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Богародзіца. Ты – вінаградная лаза праўдзівая, што ўзрасьціла нам плод жыцьця. Молім Цябе, Уладарка, разам з сьвятымі апосталамі маліся аб збаўленьні душаў нашых.

### Водпуск

Хрыстос, праўдзівы Бог наш, малітвамі ўсячыстай Сваёй Маці, сьвятых слаўных і ўсяхвальных Апосталаў, сьвятых і правядных Богабацькоў Якіма і Ганны і сьвятамучаніка Георгія, памяць якога сёньня сьвяткуем, памілуе і збавіць нас, як Добры і Чалавекалюбча.

### Літургія

**Трапар, тон 4:** У любові да Хрыста і Радзімы набожнымі бацькамі выхаваны, сьвятамучанік Георгі, суродзічу свайму, сьвятому Мяркуру Смаленскаму, пераймаючы, зброю зямную

ў рукі ўзяць мусіў, каб ад ворагаў народ свій бараніць годна. А потым, Хрыста любячы і сьвятым Ягоным пераймаючы, у час выпрабаваньня крывавага, сьвятарскі крыж узяў і прынёсшы сябе, як сьвятую ахвяру, за шчасьця народу беларускага, у сьвятая сьвятых увайшоў, дзе зараз цешысься разам з анёламі. Дык цяпер, прад пасадам Хрыста прадстоячы, малі Яго, ойча сьвяты, каб збавіў народ беларускі і падаў яму мір і вялікую міласьць.

**Кандак, тон 4:** Бацькамі, што Якіму і Ганьне пераймалі, народжаны быў ты. Ад дзяцінства прасьвятлёны зьзяньням Хрыстовым. У гадзіну выпрабавальную крыж сьвятарства прыняўшы, прыкладам дабрадзейнасьці і набожнасьці быў ты, ойча звышгодны Георгі, змагаючыся з чырвонай навалай, прапаведаваў Хрыста бязстрашна. Мучаніцкай тваёй крывёю ты ўзмацніў зьнямоглых і шлях паказаў да вызваленьня. За гэта вянцом пераможным, Хрыстос цябе карануе, а мы славу цябе сьпяваем няспынна: “Радуйся, Царквы Беларускай столп непахістны!”

**Пракімен:** Дарагая ў Гасподніх вачах сьмерць сьвятых Ягоных!

**Пс. 115:6**

**Верш:** Што аддам Госпаду за ўсе дабрачынствы Ягоныя мне?

**Пс. 115:3**

*Апостал, пач. 311*

**Алілуя:** Сьвятары Твае апранаюцца ў праўду, і сьвятыя Твае ўзрадуюцца.

**Пс. 131:9**

**Верш:** Бо выбраў Гасподзь Сіён; пажадаў яго жытлом Сабе.

**Пс. 131:13**

*Евангельля, Лк., пач. 52 (10:22-24)*

**Прычасьнік:** Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не забаіца.

Алілуя. *(тройчы)*